7. Уголовный кодекс Белорусской ССР. Москва: Государственное изд. юридической лит-ры, 1949. С. 46–47.
8. *Сидоров А. А.* Подлинная история воровского братства «Жиганы, уркаганы, блатари» 1917-1940. Москва: Эксмо, 2005. С. 270.
9. *Говоров И. В.* Советское государство и преступный мир (1920-1940-е гг.) // Вопросы истории. 2003. №11. С. 149.
10. *Разинкин В., Тарабрин А.* «Элита преступного мира. Цветная масть». Москва: Вече, 1997. С. 12.

# ГІСТОРЫЯ З'ЯЎЛЕННЯ ТАТАР НА ЗЕМЛЯХ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

**М. А. Гембіцкая**

Этнічная структура насельніцтва Беларусі і Літвы складаецца зараз са шматлікіх этнасаў, якія з цягам часу ў сілу тых ці іншых прычын апынуліся на гэтых землях і засталіся тут назаўсёды. Татары – гэта народ, які пачаў фарміраваць свае пасяленні ў Вялікім княстве Літоўскім больш за 600 гадоў таму. Ужо больш за шэсць стагоддзяў яны жывуць на землях Беларусі і Літвы. Аналіз і вывучэнне працэсу пранікнення татарскага насельніцтва на землі ВКЛ і далейшага лёсу татар дапаможа лепш зразумець сучаснае этнічнае і канфесійнае становішча ў Беларусі і Літве, прасачыць працэсы іх з'яўлення на землях ВКЛ, высветліць, ці было пасяленне татар на землях ВКЛ прымусовым або добраахвотным і вызначыць ролю вялікіх князёў у гэтым працэсе.

Пачатак цэнтралізацыі беларускіх земляў і ўсталяванне ўлады вялікага князя Гедыміна (1316–1341 гг.), а таксама стомленасць татараў пасля захопніцкіх войнаў дазволілі землям Вялікага княства Літоўскага пазбегнуць ардынскага ярма. Мангола-татары рабілі перыядычныя ваенныя паходы на землі ВКЛ, але накласці пастаянную даніну і ўсталяваць трывалую ўладу ім не ўдалося. Задоўга да Масквы, чые феадалы былі працяглы час васаламі Чынгізідаў, літоўская дынастыя ў саюзе з баярствам заходнерускіх зямель кінула смелы выклік Ардзе. І таму менавіта Вільня на доўгія дзесяцігоддзі стала асноўным цэнтрам «збірання» ўсходнеславянскіх зямель.

Першая хваля мангольскай навалы закранула паўднёвую частку Вялікага княства Літоўскага. Рускія летапісы некалькі разоў упамінаюць аб нашэсці татар Залатой Арды пры Узбек-хане на Паўднёвыя ўладанні вялікага князя Гедыміна, якія кожны раз былі разрабаваны і зняволены імі. Яны ўводзілі ў палон жыхароў столькі, колькі маглі, забіваючы пры гэтым дзяцей, старых і слабых: трэба думаць, што і літоўцы прыводзілі палонных татар на сваю зямлю. Па археалагічных звестках, яны напалі

на Гомель, разрабавалі Мазыр і Тураў. Каля Брэста адбыўся жорсткі бой з мангола-татарамі, у выніку якога было шмат забітых. Захавалася таксама паданне, што вялікі князь Міндоўг разграміў каля мястэчка Крутагор'е войскі хана Койдана. З таго часу мястэчка пачало называцца Койданава (сучасны Дзяржынск) [6; с.140–141].

Вельмі важнай падзеяй у гісторыі адносін мангола-татараў і ВКЛ стала бітва ля Сініх Вод. Альгерд, адпраўляючыся дзеля заваёўніцтва Падоліі, дзе пасля Батыя зацвердзіліся татары, прывёў туды і татар, якія складаліся з тых, хто застаўся ў Літве з часоў Гедыміна: разбіў ён трох братоў, князёў татарскіх, князя Хачыбея, Утлубуга і Дмітрыя, якія былі, па выразу летапісца, отчычы і дзедзічы Падольскай зямлі. Разгром Альгердам трох ордаў дазволіў пашырыць уладанні ВКЛ на поўдні да вусця Дняпра і Днястра, усталяваць уладу Гедымінавічаў над Кіеўскім і Валынскім княствамі, Падоллем, Чарнігаўшчынай і Севершчынай. Альгерду за два дзесяцігоддзі да Кулікоўскай бітвы ўдалося нанесці татарам першую буйную паразу, што мела не толькі тактычныя і стратэгічныя вынікі, але і прывяло да страты Ардою кантролю над значнымі тэрыторыямі, якія складалі некалі ядро Кіеўскай Русі [2; с.74].

Але няправільна было б уяўляць узаемаадносіны ВКЛ з Ардой, як толькі бясконцы перыяд барацьбы і супрацьстаяння. Яны заключалі саюзы супраць агульных ворагаў. Акрамя таго, у самой Ардзе змагаліся за ўладу варожыя групоўкі, і, як правіла, літоўскія князі маглі разлічваць на саюз з той або іншай групоўкай, з тым альбо іншым прэтэндэнтам на трон у Сараі. Летапісы, асобныя дакументы захавалі не толькі паведамленні аб войнах і бітвах, але і сведчанні аб саюзах, сумесных дзеяннях войск ВКЛ і ардынскіх атрадаў.

Няма сумнення, што яшчэ да вялікага князя Вітаўта былі пасяленні татар у Літве. У паданнях літоўскіх татар, якія былі паўтораны ў «Рысале-і-Татары-Лех», захавалі памяць аб хане Джанібеке, што ён, як распаўсюджвальнік ісламу, арганізоўваў некалькі разоў паходы ў Лэхістан (Польшчу), і пасля гэтага засталося шмат мусульман у гэтай дзяржаве. Дакладна вядома, што Гедымін вёў сяброўскія адносіны з манголамі: у радах яго войска служылі татары. Так яны складалі войска Гедыміна і ўдзельнічалі ў бітве 1319 г. з Тэўтонскім Ордэнам [5; с.3]. Частка татар, якая служыла ў Гедыміна, засталася ў яго дзяржаве і пасля вайны ва ўзнагароду атрымала землі, што падцвярджаецца сведчаннем аналіста Фрацысканскага Ордэна, які пад годам 1324 піша: «Нашы браты, якіх адправілі для пераўтварэння іх ў хрысціянскую веру Літоўскіх зямель, знайшлі ўвесь народ, паглыблены ў язычніцтва, які пакланяўся агню, і паміж імі скіфаў (Scythos), прышэльцаў з уладанняў

хана, і якія ў малітвах сваіх ужываюць азіяцкую мову» [11; с.7–9]. Скіфамі часта называлі татар. Іх магло быць тады дастаткова значная колькасць сярод жыхароў, бо манахі ўключылі іх у народанасельніцтва Літвы. Яны і склалі першыя паселішчы татар у ВКЛ. З гэтай эпохі татары нярэдка ўжо з'яўляюцца ў войнах Літвы з Польшчай ці з Нямецкім Ордэнам і сваёю мужнасцю і вернасцю прыдаюць моц Літоўскай зброі. У 1350 г. і 1352 г. татары прымалі ўдзел у польска-венгерска-літоўскім канфлікце, пэўная частка татар засталася ў 1340–50-я гг. пасля набегу хана Джанібека [с.508]. Пры Кейстуце існавала дапаможная дружына татар у паходзе 1350 г. супраць караля Казіміра Вялікага. Пасля Кулікоўскай бітвы 1380 г. у ВКЛ эміgравала група мурзаў (князёў) на чале з Мансур-Кіятам Мамаевічам, які лічыцца пачынальнікам роду Глінскіх. Князі літоўскія і рускія часта ужывалі падчас войнаў наёмныя войскі, якія існавалі на межах дзяржаў і былі гатовы дапамагаць князям супраць іх ворагаў. Іпацьеўскі летапіс свежчыць, што баяры прыводзілі на дапамогу татар «нанимающе их сребром и златом» [10; с.281]. З даўніх часоў турэцкія плямёны наймаліся ў выглядзе дапаможнага войска. У ВКЛ таксама трапляли татары-палонныя, знаходзілі прытулак збеглыя ханы і прэтэндэнты на ханскі трон.

Такім чынам, усё гэта сведчыць аб існаванні даволі актыўнай знешняй палітыкі, якую праводзіла кіраўніцтва ВКЛ на ўсходзе і поўдні як ваеннымі, так і дыпламатычнымі шляхамі. Але не менш важным для ВКЛ быў і заходні вектар знешняй палітыкі. Асноўным і самым небяспечным ворагам Літвы былі нямецкія рыцары, якія аселі ў Прыбалтыцы і Усходняй Прусіі і пагражалі самому існаванню Літоўскага княства. Небяспека нямецкай феадальнай экспансіі, ахвярамі якой ужо сталі прускія плямёны, латышы і эстонцы, была ў XIII–XIV стст. відавочнай, і ў цяжкай барацьбе з Ордэнам літоўскія князі абапіраліся не толькі на патэнцыял заходнерускіх зямель, але і часта на дапамогу ардынскіх саюзнікаў [8; с.11]. Такое ўдалае выкарыстанне сваіх паўднёвых суседзяў для сумеснай барацьбы з небяспечным заходнім ворагам стала вынікам выкарыстання вярхоўнай уладай ВКЛ унутрыпалітычных супярэчнасцяў у Залатой Ардзе ў сваіх мэтах.

Самая спрыяльная эпоха для літоўскіх татар складае княжанне выдатнага дзяржаўца – вялікага князя Вітаўта. Ужо ў пачатку яго княжання татарскія пасяленні з'яўляюцца на землях ВКЛ. Гэтую падзею перадае турэцкі гістарыёграф султана Мюрада IV Пэчэві, які жыў у канцы XVII ст.; у сваёй гісторыі Атаманскай імперыі 1520–1630 гг. ён піша: «Калі жахлівы Цімур (Тамерлан) прыйшоў у Кіпчак (у 1391 г.) шматлікія з татар былі ім узяты ў палон і забіты: але некалькі татарскіх

плямёнаў збегла ў Польшчу (гэта значыць у Літву), дзе яны і пасяліліся, так што і зараз знаходзяцца там шэсцьдзесят пасяленняў... іншыя ж плямёны, якія пакарыліся Цімуру, ваявалі ў яго радах на Волзе, тры дні, тры ночы, з Тахтамыш-ханам, які быў звернуты ва ўцёкі» [5; с.10]. Згодна з паданнямі літоўскіх татар, гэтых выхадцаў было 40000 чалавек [11; с.37]. Часткова, магчыма, гэтыя сведкі сапраўдныя, як сцвярджаюць самыя татары, што яны прыбылі сюды добраахвотна і аддаліся пад пратэкцыю вялікаму князю Вітаўту.

Можна зрабіць выснову, што практыка выкарыстання наёмнага татарскага войска, прымання татарскіх ханаў ужывалася вялікімі князямі таму, што з другой паловы XIV ст. у Ардзе ўзмацняюцца цэнтрабежныя працэсы, яшчэ больш абвастрацаецца барацьба феадальных груповак за ўладу. Гедымінавічы ўсё часцей непасрэдна ўмешваюцца ў гэтую барацьбу і падтрымліваюць тых або іншых прэтэндэнтаў на ханскі трон, дабіваючыся для сябе значных стратэгічных і тактычных выгад, у прыватнасці, падтрымкі ў барацьбе з маскоўскім палітычным цэнтрам за аб’яднанне пад сваёй уладай рускіх зямель.

У выніку барацьбы за ўладу ў Залатой Ардзе Тахтамыш, абраны з многіх прэтэндэнтаў і пасаджаны на трон Залатой Арды магутным валадаром Сярэдняй Азіі Эмірам Цімурам, здолеў дабіцца рэальнай улады. Выкарыстаўшы разгром Мамая на Куліковым полі ў 1380 г., Тахтамыш заняў сталіцу Залатой Арды – Сарай і спачатку ўсталяваў даволі мірныя адносіны з Дзмітрыем Данскім, вялікім маскоўскім князем. Але канфлікт паміж Руссю і Ардой не патух, і ў 1382 г. Тахтамыш захапіў і спаліў Маскву, пакінутую князем. Яго непамернае ўзмацненне выклікала незадавальненне Цімура, што прывяло да іх сутыкнення: яны ваявалі двойчы. Тахтамыш пацярпеў паражэнне ў сутыкненні 1391 г., але ўладу ён утрымаў. Але ў 1395 г. Тахтамыш быў прымушаны адмовіцца ад трону. З заходніх улусаў Арды ён уцёк у ВКЛ. Яму і яго світе былі выдзелены землі на Украіне, у раёне Чаркас і Канёва. Сам Тахтамыш пасяліўся ў Лідзе [4; с.7].

Такім чынам, пачатак масавым татарскім пасяленням у самым сэрцы ВКЛ паклаў Тахтамыш і яго світа. Адпраўляючыся ў літоўскія ўладанні, ён, відавочна, бачыў у іх толькі часовае сховішча, спадзяючыся хутка вярнуцца ў свае ўлусы. Вітаўт абяцаў яму сваю дапамогу з надзеяй на тое, што ўсе рускія князі аб’яднаюцца супраць іх даўняга ворага.

Перамога, атрыманая над татарамі Альгердам, абадзёрыла саюзных князёў, і Вялікі князь Маскоўскі Васіль тым з большым жаданнем прыступіў да саюзу. Такім чынам, паход назначылі правесці ў канцы 1397 г. Войскі ВКЛ прагналі ардынскіх ваяроў да Волгі, і захапілі ў

палон некалькі ўлусаў, а па іншых звестках – некалькі тысяч татар. Вітаўт адправіў частку з іх у Польшчу да свайго брата Уладзіслава, дзе палову з іх ахрысцілі і ў выніку мешаных шлюбаў татары «сталі адным народам з палякамі», – адзначае польскі даследчык Ян Длугаш. Большую ж частку прыгналі ў Літву з жонкамі і дзецьмі, дзе яны «сваім звычаям жывуць і захоўваюць сваю веру» [6; с.72]. Пасялілі іх там разам з кіпчацкімі выхадцамі, якія збеглі ад Тамерлана, утвараючы калоніі на берагах ракі Вакі ў 14 вярстах ад Вільны, а таксама ў самой Вільне і ў Трокскім, Ашмянскім і Лідскім уездах Віленскай губерні, Навагрудскім – Мінскай, Брэсцкім – Гродзенскай, на Валыні і ў Аўгустоўскай губерні [1; с.10–11].

Вітаўт зрабіў так, што шматлікія сем'і татар добраахвотна пакідалі сваю радзіму, якая была ўзрушана нязгодамі і войнамі, і прыходзілі ў Літву ў якасці перасялунцаў, чым і павялічылася колькасць татар, пераселенных Вітаўтам. Абяцаўшы Тахтамышу вярнуць прастол, вялікі князь літоўскі ў 1399 г. распачаў паход супраць Цімур-Кутлуга. Вітаўт добра разумеў выгоды саюза з гэтым ардынскім палітычным дзеячам. Ніканаўскі летапіс так перадае сутнасць перамоў паміж Вітаўтам і Тахтамышам: «Пойдзем возьмем у палон зямлю Татарскую, пераможам царства Цемір-Кутлуга, возьмем царства яго і падзелім багацце і вотчыны яго, і пасадзім у Ардзе на царства яго цара Тахтамыша і на Кафе, і на Азове, і на Крыме, і на Астрахані, і на Заецкай Ардзе, і на ўсім Прымор'і, і на Казані; і тое ўсё будзе нашым, і цар наш, а мы не толькі Літоўскай зямлёю і Польскай валодаць будзем, і Севераю, і Вялікім Ноўгарадам, і Псковам, і Немцы, але і ўсімі вялікімі княствамі Рускімі, і з усіх вялікіх князёў Рускіх пачнем дані і аброкі браць, а яны нам скарацца і служаць, і волю нашу чыняць, як мы хочам і загадваем ім» [11; с.33]. Гэта значыць, што Вітаўт хацеў зрабіць Тахтамыша сродкам сваёй палітыкі, з яго дапамогаю дабіцца кантролю над Вялікім Уладзімірскім княствам і вырашыць шэраг знешнепалітычных задач ВКЛ на ўсходзе.

12 жніўня 1399 г. на рацэ Ворскла адбылася рашаючая бітва кааліцыйных сіл ВКЛ і Тахтамыша з войскамі Залатой Арды. У Вітаўта было велізарнае войска, якое складалася з літоўцаў, рускіх, татар, палкоў Валошскіх, Польскіх і Нямецкіх; адных князёў летапісцы налічваюць да пяцідзесяці. Ардынскімі войскамі камандаваў Ідзічы Манчыт (вядомы ён пад імем Эдыгея). Рать Вітаўта была ўшчэнт разбіта, сам жа вялікі князь «побеже в мале дружине... коней перамяняючы» [8; с.122]. Уцёк і Тахтамыш. Ён апынуўся ў Сібіры, спрабаваў самастойна авалодаць ханскім пасадам, але быў забіты ў 1406 г. [12; с.21] Пасля гэтага бою пераможцы пранеслі спусташэнне па Літоўскіх уладаннях. Цімур у сваіх

пастановах замоўчвае аб гэтай бітве, якая была праіграна вялікім князем, верагодна таму, што Вітаўт змагаўся ў саюзе з ардынскімі палкаводцамі. Пасля гэтай няўдачы Вітаўт болей не ваяваў з ханамі, але не скончыў умешвацца ў справы і спэчкі, падтрымліваючы дзяцей Тахтамыша, некаторыя з якіх самі са сваімі людзьмі жылі ў Літве, а іншыя прысылалі неадначасова паслоў і падарункі, шматлікія нават з такіх татар засталіся тут назаўсёды.

Паражэнне на Ворскле прымусіла Вітаўта на некаторы час адмовіцца ад славалюбівых планаў і шукаць супрацоўніцтва з польскім каралём Ягайлам супраць небяспечнага заходняга ворага – крыжакоў. Калі пачалася Вялікая вайна тэўтонцаў з каралём Ягайлай, у шматлікай раці Вітаўта знахозіліся некалькі тысяч саюзных татар пад камандаваннем Джэлал-эд-Дзіна, сына Тахтамыша. Пераломнай у гэтай барацьбе стала Грунвальдская бітва, якая адбылася 15 ліпеня 1410 г. У ёй на баку польска-літоўскага войска выступала і татарская конніца. Сын Тахтамыша Джэлал эд-Дзін, які прыбыў у ВКЛ у 1409 г., камандаваў татарскімі войскамі. Сучасныя гісторыкі ацэньваюць колькасць татарскіх атрадаў пад Грунвальдам у 2–3 тысячы чалавек [9; с.10–11]. Гэта не так і мала, да таго ж менавіта татары атрымалі права пачаць бітву. Яны першымі ўдарылі па левым флангу крыжакоў і пры гэтым панеслі нязначныя страты. Перад войскамі Ордэна крыжакамі былі падрыхтаваны пасткі – «воўчыя ямы», але з іх лёгка ўзброеныя стэпавыя воіны выбіраліся хутчэй, чым закаваныя ў даспехі рыцары. Бітва закончылася разгромам крыжакоў. Пасля Грунвальдскай бітвы татары ўдзельнічалі ў ваенных паходах на Ордэн ў 1411 г. Джэлал-эд-Дзін пасля Грунвальдскай бітвы застаўся яшчэ на некаторы час у Літве, у 1411 г. знаходзіўся з Вітаўтам у Кіеве, хаваючыся, ад ганенняў Эдыгея. Праз год Вітаўт паспеў зацвердзіць яго на ханства Кіпчака, а ў наступны час і дзеці карысталіся яго падтрымкай. Так татары зблізіліся з Літвой яшчэ болей і засталіся яе вернымі саюзнікамі.

Ёсць усе падставы сцвярджаць, што першапачаткова служба татар практычна не адрознівалася па сваіх умовах ад выканання вайсковых абавязкаў іншымі служылымі людзьмі Вялікага княства Літоўскага, а менавіта баярамі-шляхтай. Адбыванне татарамі воінскай павіннасці выцякала непасрэдна з валодання зямлёю на воінскім, рыцарскім праве. Знатнае паходжанне і ваенная служба дазволілі ім арганічна ўвайсці ў сістэму феадальных адносін ВКЛ [6; с.47]. Разам з іншымі служылымі людзьмі яны змагаліся ў воісках ВКЛ з Маскоўскай Руссю і з татарскімі ханствамі (адносіны з апошнімі, асабліва з Крымам, абвастрыліся з канца

XV ст.). Адначасова асобныя іх атрады адбывалі павіннасць, прымаючы ўдзел у войнах, што вялі польскія каралі за межамі дзяржавы.

Як бачна з вышэйсказанага, утварэнне татар у якасці асобнай этнічнай групы на беларускіх землях звязана з імем і палітыкай Вітаўта. Менавіта яго па праву можна назваць стваральнікам татарскіх пасяленняў на Беларусі і Літве [13; с.200]. На падставе гэтых звестак можна зрабіць выснову, што татарскае насельніцтва з’яўлялася на землях ВКЛ пераважна мірным шляхам праз саюз з вялікім князем і паступленнем да яго на службу, а таксама ў якасці палонных, якія, аднак, захоўвалі свае этнічныя адметнасці. Даследчыкі сведчаць, што самі татары лічылі, што Вітаўт не прывёў іх сілаю, а запрасіў іх ваяваць супраць крыжакоў. Аўтар трактату «Рысале-і-татары-і-Лех» піша, што нібы «усюды лічаць гэтых татар нашчадкамі палонных», але аспрэчвае тое, кажучы, што «калі б яны былі палоннымі, даўно ўжо мусілі б стаць нявернымі, аднак застаюцца мусульманамі» [7; с.15].

Вялікі князь жадаў засяліць свае ўладанні як мага хутчэй, а таму не толькі жалаваў землі і розныя ільготы прышэльцам з іншых дзяржаў, але таксама і палонным татарам, бо галоўная яго мэта была ў засяленні дзяржавы, якая чакала каланізацыі. Вітаўт жалаваў татарам землі, вызначыўшы толькі абавязак з’яўляцца на вайсковую службу. Землі гэтыя даваліся з правам перадаваць іх па смерці дзецям і сваякам, а таксама першапачаткова з правам прадаць, падараваць, выкарыстоўваць іх, як захочуць; у выніку чаго шмат маёнткаў татарскіх перайшло ва ўладанне паноў. Ён таксама пасяляў іх у гарадах, а на Русі не дапускалі гэтага: «совет бысть на татарове по всем градом русским: и по сем иним княжить Рустии, согласившиеся жить меж собою, прогнаше татар из градов своих». Вітаўт таксама вызваліў паселенных татар ад усялякіх падаткаў і пабораў. Дазволіў ім свабоду веравызнання, не прымушаючы іх змяніць рэлігію.

Калі Вітаўта папракалі ў тым, што ён няверных узнагароджваў і добра з імі абыходзіўся, ён адказваў: «І самых лютых жывёл кроткасцію магчыма ўсмірыць». У Франкфурце ачарнілі Вітаўта як ворага хрысціянства, бо ён дружна жыў з татарамі. Даўшы пасяліўшымся татарам вялікія правы і прывілегіі, забяспечыўшы іх на будучы час апекай дзяржавы і законаў, ён прывязаў іх да сябе і карыстаўся ў бітвах іх вялікай дапамогай. Татары лічыліся тады выдатнымі стральцамі, коннымі і былі непараўнальны ў баях. Памяць аб Вітаўце захавалася ў іх назаўсёды з рэлігійнай глыбокай пашанай: яго называлі у сваіх малітвах і паданнях Ваттад, што значыць на арабскай мове «вельмі моцны», «мацнейшы». У просьбе Сігізмунду І 1519 г. яны пісалі: «Не маем ужо

слаўнага Вітаўта; ён не дазваляў нам забываць аб прароке, і мы, звяртаючы нашы погляды да святых месцаў, паўтаралі імя яго, як імёны нашых халіфаў. Мы прыносілі клятвы на мячы нашыя, што любім літоўцаў, калі яны ў час войн паважалі нас як ваеннапалонных, і пры ўступленні нашым у сію зямлю ўпэўнівалі, што гэты пясок, гэта вада, гэтыя дрэвы будуць для нас агульнымі. Ён вядомы нашым дзецям, і пры салёных азёрах (у Крыму) і ў Кіпчаке ведаюць, што мы ў зямле нашай не іншаземцы». Пераважная большасць татар, трапіўшы ў Літву, атрымала ад вялікага князя падараванні і ў зямельных адносінах набыла поўную незалежнасць ад знаці, паступова ўраўняўшыся з ёю і ў юрыдычных правах.

Прыток татар у Літоўскія ўладанні ішоў на працягу XV ст. Прычынай міграцыі была міжусобная барацьба прэтэндэнтаў на трон у Ардзе, многія з іх шукалі ў Літве падтрымкі і сховішча. У XV ст. межы татарскай супольнасці былі яшчэ неакрэсленыя, размытыя, паколькі перасяленцы пакуль не адчулі сябе на чужой зямлі дастаткова ўпэўнена; ніхто не мог заручыцца, што заўтра ці праз год яны не вернуцца зноў у Арду. Да самага канца XV ст., як і на пачатковым этапе, рост татарскага насельніцтва ў ВКЛ адбываўся за кошт уцекачоў з Арды, бо Літва не вяла войнаў з татарскімі ханствамі.

Такім чынам, татары карысталіся ўсімі правамі грамадскасці і жылі на Літве, як на Радзіме: з сваёю верай, мовай, звычаямі. Спрыяльныя ўмовы, рэлігійная талерантнасць, спадчынныя землі з абавязкам несці вайсковую службу – усё гэта садзейнічала масаваму перасяленню татар на землі ВКЛ. Вялікі князь даваў ім тут прытулак, ахову ад заўсёдных войнаў феадальных груповак у Залатой Ардзе, свабоду жыць са сваёй рэлігіяй, звычаямі і мовай. Прымаючы на службу ардынскіх ханаў і іх атрады або надзяляючы палонных татар зямлёй з абавязкам несці вайсковую службу, літоўскія князі набывалі ў іх асобе вопытных воінаў, мелі на мэце задачы ўнутранай каланізацыі, асваенне маланаселеных тэрыторый краіны. Значыць, з’яўленне прадстаўнікоў татарскага этнасу на беларускіх землях стала вынікам як ваенных, так і дыпламатычных зносін ВКЛ з Залатой Ардой і татарскімі ханствамі, але яно адбывалася пераважна мірным шляхам праз саюз з вялікім князем і паступленнем да яго на службу, хаця былі і палонныя татары, якія, тым не менш, захавалі свае этнічныя адметнасці.

Літоўскія кіраўнікі, прымаючы ў Літве прэтэндэнтаў на ханскі трон і іх паслядоўнікаў атрымлівалі выключную магчымасць уплываць на суадносіны сіл у Ардзе і сажаць ханаў са «сваіх» татар. Татары зберагл і свае спецыфічныя рысы і не зніклі сярод насельніцтва Вялікага княства

Літоўскага, а аформіліся ў асобную этнічную групу, якая і зараз адрозніваецца ад карэннага насельніцтва Беларусі і Літвы.

## Литература


1. *Dlugodz J.* Bitva Grunwaldzka. Krakow: Nakldem Krakowskiej Spolki Wydawnicej.
2. The peoples of the Grand Duchy of Lithuania / Ed.: G.Potashenko; Transl. from the Lith.: A.Holvoet. Vilnius: Aidai, 2002.
3. *Бялявіна В. М.* Беларускія татары: аспекты этнракультурнай адаптацыі // Пытанні мастацтвазнаўства, этналогіі і фальклярыстыкі. НАН Беларусі. Вып. 4 / рэд.-уклад. А.Г.Алфёрава. Мінск. 2008.
4. *Гембіцкая М. А.* Месца татараў у этнічнай структуры насельніцтва Беларусі // Беларус. гіст. часоп. 2005. № 11.
5. *Гришин Я. Я.* Польско-литовские татары: взгляд через века. Казань: Татар. кн. изд-во, 2000.
6. *Думін С. У., Канапацкі І. Б.* Беларускія татары: Мінулае і сучаснасць. Мінск: Полымя, 1993.
7. *Захаркевіч С. А.* Традыцыйная культура этнічных меншасцей Беларусі ў XIV-XVIII стст. // Беларус. гіст. часоп. 2005. № 10.
8. Ипатьевская летопись / Предисл. Б. М. Клосса. [Репр. воспр.]. Москва: Яз. рус. культуры: Кошелев, 1998. (Полное собрание русских летописей).
9. *Канапацкі І. Б., Смолік А.І.* Гісторыя і культура беларускіх татар: вучэб. дапам. Бел. ун-т культуры. Мн.: БУК, 2000.
10. *Канапацкі І. Б.* Татары // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. Мінск, 2001. Т.6.
11. *Мухлинский А. О.* Исследование о происхождении и состоянии Литовских татар. [Репринт. изд.]. Минск: Беларус. кооп.-выд. т-ва «Адраджэньне», 1993.
12. Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. / М.П.Касцюк, У.Ф.Ісаенка, Г.В.Штыхаў і інш.; АН Беларусі, Ін-т гісторыі. Мінск: Беларусь, 1994.


# МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ У ГРАМАДСКАЙ ДУМЦЫ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА XVI СТ.


**Я. С. Глінскі**


Грамадская думка Вялікага княства Літоўскага ў XVI ст. дала прыклад шэрагу варыянтаў стаўлення да мінулага і сучаснасці (а праз гэта і пошукаў шляхоў будучага развіцця).

Мэтай даследавання з’яўляецца раскрыццё сувязі паміж мінулым і сучасным у дыскурсе інтэлектуалаў ВКЛ XVI ст. Увага будзе засяроджана менавіта на «фармальных» праявах сувязі. Да іх адносяцца сімвалы і вобразы, праз якія здзяйсняецца сувязь, перавагі аўтараў у мінулым і сучаснасці, канструяванне імі схемы параўнання і структуры часу. Наўмысна пакінуты па-за межамі даследавання пытанні залежнасці ўяўленняў пра розныя часавыя пласты ад грамадскай пазіцыі аўтара, яго палітычнай арыентацыі і г. д. Дадзеная праца прысвечана прыватнаму